**«ГУ́ТАРКА ПАЎЛЮКА́»**, ананімны вершаваны твор бел. л-ры 19 ст. Надрукавана М.Гарэцкім у «Хрэстаматыі беларускае літаратуры. XI век — 1905 год» (Вільня, 1922). Запісана ў Валожынскім р-не на хутары Монькі каля Ракава. Пабудавана ў форме маналога. Аўтар звяртаецца да сялянскай аўдыторыі, дзякуе за тое, што мужыкі «навек з водкай рассталіся». Гарэлка ўспрымаецца як крыніца эканам. заняпаду (у п'яніцы «хата падпёрта, крывая»), прычына маральнай дэградацыі (п'яны «сын лае сваю матку, гоніць з хаты бацьку»). У творы наследуецца традыцыя бел. фальклору — гарэлка лічыцца вынаходніцтвам чорта, які зводзіць чалавечую душу («навек душа ў пекле згіне»). Недалёка ад чорта стаіць і пан, які не зважаючы на ксяндза і Бога, губіць людзей гарэлкай («Хоць ксяндзы нам піць бароняць, // Паны водку, аднак, гоняць»). Аўтар спачувае селяніну, які цяжка працуе («як чорны вол») і якому нічога не застаецца, акрамя як «з гора выпіць кватэрку». Гарэлка, на думку аўтара, толькі павялічвае залежнасць мужыка, прымушае працаваць задарма. Паўстае ў творы і вобраз яўрэя-карчмара (Бэркі), які аднак не дэманізуецца, бо не яўрэй, а «пан корчмы новыя стаўляе, // З бровараў гарэлку дастаўляе...». Няглядзячы на выразны быт. характар абмаляванай праблемы — выкрыцця п'янства, гутарка мае выразны антыпрыгонніцкі змест: у адным шэрагу знаходзяцца пан (аўтар сац. зла) і чорт («Боскі неслух»). Набліжаецца да такіх твораў бел. л-ры, як «Два д'яблы» К.Вераніцына і «Нячысцік» А.Рыпінскага. *В.І.Еўмянькоў.*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова